Лічэбнік *(6 клас)*

1.Адзначце лічэбнікі: а) чацвёрты; б) адна другая; в) сотня; г) тысяча; д) нямнога.

2.Вызначце від лічэбнікаў паводле складу: а) тры _____; б) пяцьдзясят _____; в) шэсць сёмых _____; г) васямнаццаць _____; д) дзевяноста _____

3.Адзначце лічэбнікі, у якіх на канцы пішацца мяккі знак: а) 900; б) 7; в) 20; г) 6; д) 15.

4.Адзначце склонавыя формы лічэбнікаў, запісаныя памылкова: а) Н.шэсцьсот; б) Р.шасцісот; в) Д.шасцісот; г) В.шэсцьсот; д) Т.шасцістамі; е) М.(аб) шасцістах.

5.Адзначце спалучэнні, у якіх правільна дапасаваны лічэбнікі да назоўнікаў: а) пяцёра парсючкоў; б) трое жанчын; в) у класе іх было сямёра; г) восем гусей; д) чацвёра нажніц.

6.Адзначце правільна напісаныя парадкавыя лічэбнікі: а) трынацаты; б) сямнаццаты; в) восьмы; г) чатырохсоты; д) сямідзясяты.

7.Адзначце склонавыя формы, у якіх назоўнік пры лічэбніку ўжыты памылкова: а) Н.паўтара метра; б) Р.паўтара метра; в) Д.паўтара метра; г) В.паўтара метра; д) Т.паўтара метрамі; е) М.(аб) паўтара метрам.

8.Адзначце лічэбнікі, якія ў форме творнага склону запісаны правільна: а) пяццю; б) сяммю; в) трыццаццю; г) васямнаццаццю; д) адзінацаццю.

9.Адзначце склонавыя формы лічэбніка, запісаныя памылкова: а) Н.сорак; б) Р.сорак; в) Д.сорак; г) В.сорак; д) Т.сарака; М.(аб) сарака.

10.Адзначце лічэбнікі, якія маюць форму роду: а) дзесяць чацвёртых; б) абодва; в) мільён; г) адзін; д) трыста пяцьдзясят пяты.

11.Адзначце лічэбнікі з націскам на першым складзе: а) трое; б) пяцярым; в) васямнаццаты; г) дваіх; д) семдзесят.

12.Адзначце дробавыя лічэбнікі: а) пяцёра; б) паўтара; в) дзевяць шостых; г) тры і сем дзясятых; д) дванаццаць цэлых і адна другая.

13.Адзначце парадкавыя лічэбнікі: а) дзясяцера; б) восьмы; в) сямімільённы; г) чатыры трэція; д) шасцідзясяты.

14.Адзначце лічэбнікі, у якіх змяняецца толькі апошняя частка: а) тры адзінаццатыя; б) тысяча чатырыста пяцьдзясят шосты; в) дзвесце дваццаць сёмы; г) чатырохсоттысячны; д) восемсот дзевяць.

15.Адзначце колькасныя лічэбнікі: а) шэсцьдзесят; б) абое; в) пяцёра; г) дваццаць восем; д) дзевятнаццаты.

16.Адзначце лічэбнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца ***ь****:* а) шэсц_сот; б) вас_мюстамі; в) дзевяц_сот; г) сям_наццаць; д) сем_дзесят.

17.Адзначце лічэбнікі, якія пішуцца ў два словы: а) 300; б) 302; в) 324; г) 703; д) 1000.

18.Адзначце лічэбнікі, якія пішуцца разам: а) (шэсць)сот; б) (пяць)тысяч; в) (трох)мільённы; г) (пяці)соты; д) (шасці)дзясяты.

19.Які колькасны лічэбнік змяняецца па родах, ліках і склонах: а) адзін; б) два; в) тры; г) чатыры; д) пяць.

20.Якія лічэбнікі змяняюцца як назоўнікі і маюць род і лік: а) нуль; б) адзін; в) тысяча; г) мільён; д) мільярд.

21.Якія лічэбнікі ў творным склоне маюць на канцы ***–ма****:* а) адзін; б) два; в) тры; г) чатыры; д) пяць.

22.Які лічэбнік змяняецца як назоўнік першага скланення: а) восем; б) паўтара; в) дзвесце; г) тысяча; д) мільён.

23.Адзначце назоўнікі, якія могуць спалучацца са зборнымі лічэбнікамі ***двое, трое*** *і інш.:* а) касец; б) ягня; в) дуб; г) конь; д) вілы.

24.Адзначце сказы, у якіх словазлучэнні ***назоўнік+ лічэбнік*** *выступаюць у ролі дзейнікаў:* а) Мяцеліца не сціхала на працягу трох сутак; б) На абедзвюх старонках часопіса прыведзены цікавы ілюстрацыйны матэрыял; в) Неабходна тэрмінова даставіць пяцідзесяці трох пасажыраў да месца прызначэння; г) У горадзе адкрыліся трыццаць два дзіцячыя садкі; д) У гняздзе на старой ліпе вывеліся чатыры бусляняты.